

# Sprawy trudne

## Z dziejów stosunków polsko-białoruskich w latach 1918-1945

## Geneza, konteksty, konsekwencje

*Zbiór prac naukowych*
*II i IV Międzynarodowej Konferencji Historycznej.*
*Minsk, 2010–2012 r.*

# Спрэчныя пытанні

## З гісторыі польска-беларускіх узаемаадносін у 1918-1945 гг.

## Генезіс, кантэкст, вынікі

*Зборнік навуковых прац*
*II і IV міжнародных навукова-тэарэтычных канферэнцый.*
*Мінск, 2010–2012 гг.*

# Спрэчныя пытанні

**З гісторыі польска-беларускіх узаемаадносін у 1918–1945 гг.**

## Генезіс, кантэкст, вынікі

***Зборнік навуковых прац***
***II і IV міжнародных навукова-тэарэтычных канферэнцый***
***Мінск, 2010–2012 гг.***

Мінск
І. П. Логвінаў
2013

**Аляксандр Вабішчэвіч**

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ І ПАШЫРЭННЕ ГІСТАРЫЧНЫХ ВЕДАЎ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 ГГ.)

На тэрыторыі заходняй часткі Беларусі, што ў 1921 г. увайшла ў склад Польшчы, ва ўмовах пашыранай сярод беларускага насельніцтва непісьменнасці і малапісьменнасці, адсутнасці сеткі дзяржаўных адукацыйных устаноў прыярытэтнае значэнне набывала асветніцтва — дзейнасць па распаўсюджванні асветы сярод насельніцтва, павышэнні яго агульнаадукацыйнага ўзроўню. Для фарміравання яго нацыянальнай свядомасці немалаважнае значэнне мелі гістарычныя веды. Менавіта іх распрацоўкай і пашырэннем пачала займацца нешматлікая заходнебеларуская інтэлігенцыя — як на грамадска-арганізацыйным, так і на індывідуальным узроўнях. Адной з такіх арганізацый было Беларускае навуковае таварыства (БНТ), заснаванае яшчэ ў 1918 г. Пасля ўключэння ў красавіку 1922 г. Віленшчыны ў склад Польшчы БНТ стала адзінай у краіне легальнай беларускай грамадскай арганізацыяй навуковага профілю. Паводле статута, таварыства магло займацца ўтрыманнем музея, бібліятэкі, навукова-асветніцкай і выдавецкай працай[84]. Асноўную ролю ў функцыянаванні БНТ выконвала яго ўправа, старшынёй якой на працягу 1921–1939 гг. з'яўляўся А. Луцкевіч. Арганізацыйная структура таварыства складвалася павольна і канчаткова аформілася толькі ў пачатку 1930-х гг.: аснову яе складалі секцыі — музейная, мовазнаўчая, літаратурна-мастацкая і гістарычная.

Спецыфікай БНТ з'яўлялася адсутнасць пастаяннага членскага складу, што было выклікана як ідэалагічнымі разыходжаннямі, так і адтокам яго членаў у заходнебеларускія партыйныя структуры, вымушаным выездам у БССР у першай палове 1920-х гг. М. Гарэцкага, А. Грыневіча, А. Смоліча і іншых дзеячаў. Пасля судовага працэсу Грамады пад уплывам ідэйна-палітычнай дыферэнцыяцыі і суб'ектыўных фактараў адбыўся раскол таварыства: з яго выйшлі дзеячы Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі (БХД), перасталі супрацоўнічаць прадстаўнікі рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў. Улічваючы дачыненне лідэраў БНТ (асабліва А. Луцкевіча) да стварэння лагера "беларускай санацыі", які прытрымліваўся антысавецкіх і антыкамуністычных поглядаў, у адносінах да іх праяўлялася бескампрамісная пазіцыя з боку кіраўніцтва Кампартыі Заходняй Беларусі[85]. Усё гэта звужвала сацыяльную базу таварыства, аснову якой складала частка інтэлігенцыі, навучэнцкай і студэнцкай моладзі. Часовае ажыўленне дзейнасці арганізацыі ў пачатку 1930-х гг., выклікане яго папаўненнем студэнтамі і выпускнікамі Віленскага і Пражскага ўніверсітэтаў, змянілася яе дэстабілізацыяй у выніку ўнутранага канфлікту і канчатковага разрыву ў 1935 г. А. Луцкевіча і яго прыхільнікаў з Р. Астроўскім. На фоне ліквідацыі заходнебеларускіх грамадскіх структур БНТ працягвала дзейнічаць да верасня 1939 г., хоць і не стала масавай арганізацыяй — разам з членамі грамадскага фонду па падтрымцы беларускага музея там налічвалася 120 чалавек[86].

Нягледзячы на сацыяльную абмежаванасць, БНТ імкнулася самастойна ажыццяўляць даследчыцкую і навукова-асветніцкую працу па наступных напрамках: захаванне музейных збораў, навукова-пошукавая праца; распрацоўка беларускай навуковай тэрміналогіі; падрыхтоўка і выданне вучэбнай, навукова-папулярнай літаратуры; прапаганда гістарычных ведаў. Прыярытэтнае значэнне мела пераўтварэнне прыватнай калекцыі І. Луцкевіча ў заснаваны пры БНТ у 1921 г. Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны

[84] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). — Ф. 3. — Воп. 1. — Спр. 3. — Арк. 1–4.

[85] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 242-п. — Воп. 1. — Спр. 247. — Арк. 39–40.

[86] БДАМЛіМ. — Ф. 3. — Воп. 1. — Спр. 1; Спр. 4.

музей імя І. Луцкевіча, які размясціўся разам з беларускай гімназіяй у будынку ў базыліянскіх мурах[87]. Пры камплектаванні калекцый у беларускім музеі выкарыстоўваўся ў асноўным эклектычны падыход: у іх уключаліся артэфакты розных галін навукі і культуры — археалогіі, этнаграфіі, нумізматыкі, выяўленчага мастацтва і народных промыслаў, пісьменнасці і кнігадрукавання. У пачатку 1937 г. там налічвалася 4,2 тыс. адзінак захавання. У бібліятэцы музея да пачатку 1930-х гг. утрымлівалася каля 14 тыс. кніг, сярод якіх былі рукапісныя фаліянты (Жухавіцкае евангелле XIV ст., кітаб XVI ст. і інш.), старадрукі (Трыёдзь каляровая 1491 г., частка пражскага выдання Бібліі Ф. Скарыны 1517 г., кнігі друкарняў Беларусі XVI–XVIII стст. і інш.), разнастайныя па тэматыцы савецкія выданні, перыядычны друк. У фондзе архіва, які налічваў каля 6 тыс. адзінак, былі помнікі пісьменнасці XIV–XV стст., граматы XIV–XIX стст., матэрыялы асабістага паходжання, дакументы заходнебеларускіх арганізацый і ўстаноў[88].

У БНТ асноўнымі формамі навукова-асветніцкай працы з'яўляліся навуковыя сходы і ўрачыстыя мерапрыемствы ("акадэміі"), лекцыі, даклады і паведамленні. Сярод значных мерапрыемстваў гісторыка-мемарыяльнага характару, у якіх удзельнічала таварыства, былі наступныя: у 1925 г. — да 400-годдзя беларускага кнігадрукавання; 1929 г. — да 400-годдзя Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 г.; 1930 г. — да 500-годдзя смерці князя ВКЛ Вітаўта і інш. Да правядзення навукова-папулярных лекцый гістарычнай тэматыкі з 1932 г. далучылася падкантрольнае БНТ студэнцкае аб'яднанне "Скарынія"[89]. Прапагандай навуковых ведаў у ходзе працы асобных секцый — мовазнаўчай, этнаграфічнай, гісторыка-эканамічнай, літаратурнай, назапашваннем эмпірычнага матэрыялу ў ходзе этнаграфічных экспедыцый займаўся з 1931 г. навуковы гурток студэнтаў-беларусаў Віленскага ўніверсітэта імя С. Баторыя — Таварыства прыяцеляў беларусаведы, з якім актыўна супрацоўнічала БНТ[90].

Улічваючы тое, што лідары БНТ публічна засведчылі палітычную лаяльнасць адносна польскіх улад і адмоўныя адносіны да заходнебеларускага камуністычнага руху, савецкай Беларусі, то рэжым "санацыі" ажыццявіў нязначныя ўступкі: у 1931 г. беларускаму музею ў Вільні быў нададзены статус навуковай установы, таварыства было дапушчана да агульнапольскіх навуковых мерапрыемстваў, выставак. А. Луцкевіч прадстаўляў БНТ на X з'ездзе Саюза музеяў Польшчы (1934 г.), VI Агульнапольскім з'ездзе гісторыкаў (1935 г.). Аднак такія пратэкцыяніcцкія меры кан'юнктурна-прагматычнага характару не змянілі істотна агульнага стаўлення ў Польшчы да беларускай праблематыкі як рэгіянальнай.

Ажыўленне дзейнасці БНТ у пачатку 1930-х гг. дазволіла пераадолець замкнуты характар беларускага музея, аблегчыла доступ да яго фондаў для розных катэгорый наведвальнікаў: напрыклад, у 1932 г. з імі азнаёміліся замежныя даследчыкі (М. Біржышка з Коўна, Г. Віршубскі з Берліна), навукоўцы і грамадскія дзеячы з Вільні, студэнты Віленскага ўніверсітэта імя С. Баторыя, вучні Віленскай беларускай гімназіі[91]. Паводле розных ацэнак, на працягу 1933–1938 гг. музей наведалі 14,5 тыс. чалавек, наладжана было 428 экскурсій[92].

Аналіз архіўных крыніц сведчыць аб тым, што нармальнаму функцыянаванню беларускага музея перашкаджалі фінансавыя цяжкасці[93]. Пасля атрымання статусу навуковай установы абяцанае паўнацэннае фінансаванне з боку Польскай дзяржавы было фактычна падменена выдзяленнем невялікіх

[87] Biblioteka Akademios mokslio Lietuvos. Skyriuus manuskriptai (BAML SM). — F. 21. — B. 2237. — L. 6. Litewski.

[88] Вабішчэвіч, А.М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А.М. Вабішчэвіч. — Брэст: Выд-ва БрДУ, 2008. — С. 65.

[89] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). — Ф. 1. — Воп. 9. — Спр. 1622. — Арк. 842адв.

[90] БДАМЛіМ. — Фонд 3. — Воп. 1. — Спр. 24. — Арк. 129, 134; Спр. 23. — Арк. 12адв., 54; Спр. 25. — Арк. 25; НАРБ. — Ф. 242-п. — Воп. 1. — Спр. 435. — Арк. 73.

[91] BAML SM. — F. 21. — B. 2049. — L. 2. Litewski; БДАМЛіМ. — Ф. 3. — Воп. 1. — Спр. 2. — Арк. 1–28.

[92] Гужалоўскі, А. А. Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А. Гужалоўскі. — Мінск: НАРБ, 2002. — С. 112; Спадчына. — 1995. — № 1. — С. 34.

[93] Lietuvos Centrinis Valstybinis Archyvas (LCVA). — F. 281. — Ap. 1. — B. 10; B. 11. Litewski; БДАМЛіМ. — Ф. 3. — Воп. 1. — Спр. 6. — Арк. 1–21; Спр. 7. — Арк. 1–34.

сродкаў, якія былі выкарыстаны для інвентарызацыі экспанатаў музея і бібліятэкі. Адной з крыніц папаўнення сродкаў з'яўляліся прыватныя ахвяраванні.

Нягледзячы на дасягненне пэўнай стабілізацыі, дзейнасць БНТ у перыяд 1931–1939 гг. можна ацаніць у якасці супярэчлівай. З аднаго боку, калі ўлічыць дынаміку дзейнасці музея і яе выніковасць, то можна пагадзіцца з высновай А. Гужалоўскага аб тым, што ў канцы 1930-х гг. гэтая ўстанова была напярэдадні чарговага ўздыму[94]. З другога боку, фінансавы і адміністрацыйна-паліцэйскі ўціск, спробы канчатковай ліквідацыі беларускага музея (у ходзе яго аб'яднання з музеем Літоўскага навуковага таварыства ў адзіны рэгіянальны дзяржаўны музей, які прапаноўвалі ўзначаліць А. Луцкевічу[95]), ставілі пад сумненне далейшыя перспектывы існавання БНТ. Наогул, таварыства не змагло стаць каардынуючым органам навукова-даследчыцкай працы ў межах усёй Заходняй Беларусі, не здолела наладзіць палявыя этнаграфічныя даследаванні. Слабой была яго выдавецкая дзейнасць: пераважала вучэбная і навукова-папулярная літаратура; штогоднік і зборнік "Запісы БНТ" аказаліся эпізадычнымі выданнямі, не ўдалося наладзіць іх рэгулярнага выхаду ў друк. БНТ перастала дзейнічаць ужо ў новых грамадска-палітычных умовах восенню 1939 г. На працягу 1940–80-х гг. у гістарычнай навуцы і свядомасці беларускай грамадскасці дзейнасць гэтага таварыства адназначна атрымоўвала негатыўныя ацэнкі, асабліва пад уплывам ідэалагічна-палітычных акалічнасцей — частка яго лідараў (А. Луцкевіч, У. Самойла, А. Неканда-Трэпка, В. Багдановіч) была рэпрэсавана савецкімі ўладамі, некаторыя далучыліся да лагера беларускіх калабарантаў у 1941–1944 гг., у пасляваенны час апынуліся ў эміграцыі.

Акрамя БНТ, прыярытэтнае значэнне гісторыка-культуралагічным даследаванням надавалася заходнебеларускімі выданнямі нацыянальна- і хрысціянска-дэмакратычнай арыентацыі. Праведзены кантэнт-аналіз зместу зборнікаў, манаграфічных выданняў, артыкулаў па айчыннай гісторыі і культуры, змешчаных на старонках часопісаў "Шлях моладзі", "Студэнцкая думка", "Калоссе", "Хрысціянская думка" і іншай перыёдыкі, рукапісных матэрыялаў, што захоўваюцца ў архіўных фондах, дазволіў выдзеліць шэраг іх канцэптуальных палажэнняў.

Па-першае, вытокі дзяржаўнасці Беларусі адносіліся да часоў Полацкага і іншых старажытных княстваў[96]. У асобных гістарычных працах назіралася абсалютызацыя нацыянальнай праблемы, выказваліся меркаванні аб выключнасці беларусаў сярод іншых славянскіх народаў. Напрыклад, Я. Станкевіч на падставе моўных звестак спрабаваў высветліць "беларускасць" некаторых славянскіх плямёнаў, праблему іх рассялення, прыпісваў полацкім князям XII ст. беларускую нацыянальную свядомасць[97]. Аднак яго гістарычныя даследаванні не вызначаліся грунтоўнай метадалагічнай базай, у іх амаль адсутнічала крытычнае стаўленне да гістарычных крыніц ці яны проста запазычваліся ў іншых аўтараў.

Па-другое, ВКЛ лічылася поліэтнічнай (беларуска-літоўскай) дзяржавай. Паводле В. Грышкевіча, яго станаўленне як поліэтнічнай дзяржавы адбывалася ва ўмовах барацьбы літоўскай і беларуска-ўкраінскай (усходнеславянскай) арыстакратыі[98]. А. Станкевіч адмаўляў тэзіс аб гвалтоўным захопе заходнебеларускіх зямель літоўскімі феадаламі ў час станаўлення ВКЛ. За ўсходнеславянскім этнічным кампанентам прызнавалася вядучае месца ў духоўным жыцці дзяржавы[99].

[94] Гужалоўскі, А. А. Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) . — С. 113.

[95] Антон Луцкевич: материалы следственного дела НКВД БССР / подгот. к печати, введение и комментарии В. Н. Михнюка, Н. М. Климовича и А. Н. Гесь. — Минск: БелНИИДАД, 1997. — С. 192; Запісы Беларускага навуковага таварыства. — Вільня, 1938. — Сш. 1. — С. 40.

[96] Станкевіч, А. Вітаўт Вялікі і беларусы / А. Станкевіч. — Вільня: Выд. Бел. нац. камітэта, 1930. — С. 3–4; Станкевіч, А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. — Вільня: Выд-ва "Шляху моладзі", 1934. — С. 3–4; Станкевіч, А. Хрысціянства і беларускі народ: (спроба сынтэзы) / А. Станкевіч. — Вільня: Беларус. друк. імя Ф. Скарыны, 1940. — С. 8–10; BAML SM. — F. 21. — B. 331. — L. 1–15.

[97] Станкевіч, Я. Гістарычныя творы / Я. Станкевіч. — Мінск: Энцыклапедыкс, 2003. — С. 29–30.

[98] БДАМЛіМ. — Ф. 3. — Воп. 1. — Спр. 13. — Арк. 9.

[99] Станкевіч, А. Беларусы як нацыянальная меншасць у Польшчы / А. Станкевіч // Беларускі гістарычны часопіс. — 1995. — № 2. — С. 111; Станкевіч, А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. — Вільня: Выд-ва "Шляху моладзі", 1934. — С. 8.

Частка радыкальна настроеных нацыянальна-дэмакратычных дзеячаў Заходняй Беларусі празмерна абсалютызавала выключна монаэтнічны (беларускі) характар ВКЛ, ігнаравала яго поліэтнічны, поліканфесіянальны характар. Напрыклад, Я. Станкевіч называў дзяржаву Вялікім княствам беларускім, а яго кіраўнікоў — адпаведна "вялікімі князямі беларускімі" ("літоўскімі")[100]. М. Шкялёнак, у публікацыях якога ўтрымліваліся русафобскія і паланафобскія элементы, уступаў у палеміку з літоўскімі даследчыкамі, якія давалі монаэтнічную (літоўскую) інтэрпрэтацыю гісторыі ВКЛ і разглядалі яе ў якасці аднаго са сродкаў вырашэння віленскага пытання. Такая радыкальная пазіцыя адносна літоўскіх (як і польскіх) даследчыкаў разглядалася ў якасці рэакцыі на адпаведна літоўскі і польскі этнацэнтрызм, як імкненне прадставіць мінулае і сучаснасць з беларускіх нацыянальных пазіцый[101].

Па-трэцяе, прызнаваўся вышэйшым агульны культурны ўзровень усходнеславянскага (беларускага) насельніцтва ў ВКЛ, падтрымлівалася ідэя пра "залаты век" беларускай культуры ў XVI ст.[102]. Заходнебеларускія аўтары ідэалізавалі князя ВКЛ Вітаўта[103]. Давалася высокая ацэнка дзейнасці Ф. Скарыны, яго гуманістычнаму светапогляду[104]. Сярод фактараў, што спрыялі культурнаму ўздыму ВКЛ у XVI ст., А. Станкевіч вылучаў яго дзяржаўную самастойнасць, зводы законаў феадальнага права (статуты), магдэбургскае права і інш.

Па-чацвёртае, негатыўна ацэньваліся Люблінская унія 1569 г. і Брэсцкая царкоўная унія 1596 г., якія паспрыялі заняпаду дзяржаўнасці ВКЛ[105]. Адначасова ідэалізавалася роля ўніяцкай царквы ў захаванні культурна-моўнай самабытнасці беларускага народа[106]. Крызісныя з'явы ў духоўным жыцці ВКЛ у XVII–XVIII стст. М. Гарэцкі тлумачыў слабасцю яго сацыяльнай структуры, павярхоўнай "культурнасцю" большасці шляхецкага саслоўя, што арыентавалася на польскія духоўныя і рэлігійныя ўзоры[107]. У палітычнай публіцыстыцы Б. Тарашкевіча аспрэчваўся тэзіс польскай гістарычнай навукі і грамадскай думкі аб цывілізацыйным уплыве палякаў на беларусаў у часы Рэчы Паспалітай: "польскае грамадства не прынесла … вялікай культуры"[108]. Сярод негатыўных фактараў адзначаліся таксама страта палітычнай незалежнасці ВКЛ, драматычнае супрацьстаянне на беларускіх землях праваслаўнай і каталіцкай цэркваў.

Па-пятае, вынікі ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі ацэньваліся негатыўна. Паводле М. Ільяшэвіча, у рэлігійным пытанні Кацярына II імкнулася да падпарадкавання рымска-каталіцкага касцёла і пашырэння ўплыву праваслаўнай царквы, рашуча праследавала ўніяцтва[109].

Па-шостае, у грамадска-палітычным жыцці Беларусі XIX — пачатку XX ст. прыярытэтнае месца адводзілася менавіта беларускаму нацыянальнаму фактару. Асоба К. Каліноўскага, які прызнаваўся "палітычным рамантыкам" і адначасова "змагаром за палітычную самастойнасць Беларусі і Літвы"[110], разглядалася А. Станкевічам у адным ідэалагічным кантэксце з "Мужыцкай праўдай" і часопісам "Гоман". А. Станкевіч прызнаваў уплыў на ідэйна-палітычнае самасцвярджэнне К. Каліноўскага рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў А. Герцэна, М. Бакуніна, М. Кастамарава, Т. Шаўчэнкі. Закранаючы нацыянальныя аспекты паўстання 1863 г., аўтар адзначаў, што ў К. Каліноўскага не было "бела-

[100] Станкевіч, Я. Гістарычныя творы. С. 29–30.

[101] Запісы Беларускага навуковага таварыства. С. 69.

[102] Гарэцкі, М. Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі. — Мінск: Маст. літ., 1992. — С. 100; Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў (ЦНБ НАНБ. АРКР). — Ф. 7. — Воп. 2. — Спр. 36. — Арк. 1–53; Тарашкевіч, Б. Выбранае: крытыка, публіцыстыка, пераклады / Уклад., уступ і камент. А. Ліса. — Мінск: Маст. літ., 1991. — С. 81.

[103] Станкевіч, А. Вітаўт Вялікі і беларусы. С. 30–31.

[104] Станкевіч, А. Доктар Францішак Скарына — першы друкар беларускі (1525–1925) / А. Станкевіч. — Вільня: Крыніца, 1925. — С. 50–60.

[105] Шкялёнак, М. Беларусь і суседзі: гістарычныя нарысы / М. Шкялёнак. — Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства, 2003. — С. 122.

[106] Станкевіч, А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. С. 9.

[107] Гарэцкі, М. Гісторыя беларускае літаратуры. С. 11, 103.

[108] Тарашкевіч, Б. Выбранае: крытыка, публіцыстыка, пераклады. С. 99.

[109] Ільяшэвіч, М. Расійская палітыка на землях былога Беларуска-Літоўскага гаспадарства за панавання Кацярыны II і Паўла I (1772–1801) / М. Ільяшэвіч. — Вільня, 1933. — С. 18.

[110] Станкевіч, А. Кастусь Каліноўскі, "Мужыцкая праўда" і ідэя незалежнасці Беларусі / А. Станкевіч. — Вільня: Выд. Бел. нац. камітэта, 1933. — С. 21.

рускага нацыяналізму ў сучасным разуменні, але ў яго, як і ў многіх са шляхты, былі яшчэ жывыя традыцыі ВКЛ"[111]. У супрацьвагу рамантызаванаму вобразу нацыянальнага героя ў шэрагу твораў заходнебеларускай літаратуры ("Смерць Кастуся Каліноўскага" М. Машары, "Каліноўскі" М. Танка) быў прадстаўлены вобраз К. Каліноўскага як тыповага рэвалюцыянера. Дзеячы заходнебеларускага камуністычнага руху разглядалі К. Каліноўскага не як кіраўніка польскага руху, а як змагара з сацыяльным і нацыянальным прыгнётам беларусаў, што пераклікалася з ацэнкамі дзеячаў БХД. Паводле А. Луцкевіча, на старонках часопіса "Гоман" упершыню быў сфармуляваны пастулат "дзяржаўнай самастойнасці Беларусі ў складзе Расійскай федэрацыі". Ім таксама прызнавалася беларуская этнічная прыналежнасць рэвалюцыянера-народавольца І. Грынявіцкага, які ўдзельнічаў у замаху на цара Аляксандра II 1 сакавіка 1881 г.[112].

Па-сёмае, ігнаравалася беларуская савецкая дзяржаўнасць і перавага надавалася спробе ўстанаўлення дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай аснове, г. зн. Беларускай Народнай Рэспубліцы (БНР). А. Станкевіч выступаў з вострай крытыкай беларускага савецкага гісторыка С. Агурскага, які адмаўляў дачыненне К. Каліноўскага да друкавання "Мужыцкай праўды". Асабліва непрымірымую пазіцыю адносна беларускай савецкай гістарычнай навукі праяўляла радыкальнае крыло нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі ў другой палове 1930-х гг. М. Шкялёнак падвергнуў крытыцы перыядызацыю гісторыі Беларусі У. Ігнатоўскага і прапанаваў уласную, даволі спрэчную і недастаткова абгрунтаваную: перыяд асобных дзяржаў (княстваў) — IX — сярэдзіна XIII ст.; перыяд поўнай ("суцэльнай") дзяржаўнасці — сярэдзіна XIII — канец XVII ст.; перыяд заняпаду беларускай дзяржаўнасці — з канца XVII ст.[113].

У цэлым, нягледзячы на шырокі тэматычна-праблемны дыяпазон прац, некаторыя разыходжанні ў ацэнках тых ці іншых гістарычных падзей і асоб, у асяроддзі заходнебеларускіх аўтараў выразным было дамінаванне нацыянальна-дэмакратычных пазіцый у асвятленні гісторыі Беларусі. На гэта паўплываў цэлы шэраг фактараў: перавага сярод беларускіх даследчыкаў прыхільнікаў нацыянальна- і хрысціянска-дэмакратычных поглядаў; уздзеянне агульнай тэндэнцыі ўзмацнення беларускага нацыянальнага руху з 1917 г.; нерэалізаванасць спроб па стварэнні беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай аснове, што садзейнічала пошукам пазітыўных асноў у гістарычным мінулым беларускага народа; негатыўныя вынікі нацыянальнай палітыкі адносна беларусаў у Польскай дзяржаве. У адрозненне ад нацыянальна- і хрысціянска-дэмакратычнай інтэлігенцыі прадстаўнікі рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку ў сваёй дзейнасці менш увагі надавалі вывучэнню і прапагандзе гісторыі Беларусі, бо разглядалі нацыянальнае пытанне не асобна, а толькі ў цеснай сувязі з вырашэннем сацыяльных праблем беларускага насельніцтва, звязвалі яго паўнацэннае нацыянальна-культурнае развіццё выключна з уз'яднаннем у межах адзінай савецкай Беларусі.

Заходнебеларускія землі ў складзе Польшчы былі слаба ахоплены планамернымі і сістэматычнымі навуковымі даследаваннямі, для гэтага там не была створана адпаведная інфраструктура. У тых жа даследаваннях, якія ўсё-такі ажыццяўляліся намаганнямі польскіх навуковых устаноў, грамадскіх арганізацый і прыватных асоб, нярэдка прэваліравалі палітыка-ідэалагічныя падставы. Адчувальны ўплыў аказвала тэорыя польскага рэгіяналізму, якая набыла тэарэтычнае абгрунтаванне ў 1926 г. Аналіз праграмных палажэнняў і асабліва практычнай рэалізацыі рэгіяналізму дазваляе прызнаць яго выгадным для польскіх улад пры выкананні наступных задач: 1) інтэграцыйнай — для прадухілення і мінімізацыі непажаданых для польскіх улад вынікаў каланізацыі "ўсходніх крэсаў", недапушчэння там беларускага нацыянальнага руху (у іх разуменні — сепаратысцкага і антыдзяржаўнага); 2) асіміляцыйнай — шляхам прапаганды рэгіянальнага характару асобных этнічных субкультур як неадрыўных частак агульнапольскай культуры[114]; 3) кансервацыйнай — для захавання

[111] Станкевіч, А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. С. 23.

[112] BAML SM. — F. 21. — B. 340. — L. 32. Litewski; БДАМЛіМ. — Ф. 3. — Воп. 1. — Спр. 271. — Арк. 34.

[113] Запісы Беларускага навуковага таварыства. С. 39.

[114] Цітовіч, І. У. Краязнаўчы рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / І. У. Цітовіч; РІВШ БДУ. — Мінск, 2006. — С. 12.

заходнебеларускіх зямель (асабліва Палесся) у якасці анклава з традыцыйным укладам і побытам сельскага насельніцтва. Недастаткова абгрунтаванымі з'яўляюцца высновы папярэдніх даследчыкаў адносна адназначна станоўчай ролі рэгіяналізму ў падтрыманні статус-кво заходнебеларускай вёскі, захаванні яе ад нівеліруючых уплываў мадэрнізацыйных працэсаў[115], бо дасягалася гэта шляхам архаізацыі грамадска-культурнага жыцця, абмежавання яго перспектыў дынамічнага і эфектыўнага развіцця.

Тэорыя рэгіяналізму аказала ўплыў на выпрацоўку заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны — распараджэння прэзідэнта аб ахове помнікаў ад 6 сакавіка 1928 г. і закона ад 25 студзеня 1933 г., які ўносіў змены ў згаданае распараджэнне. Акрамя дэпартамента мастацтва ў складзе міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы, у канцы 1920-х гг. адпаведныя аддзелы былі створаны пры ваяводскіх упраўленнях. У Палескім ваяводстве ініцыятарам заснавання аддзела мастацтва і культуры быў Р. Гарашкевіч, настаўнік і актывіст краязнаўчага руху, які дамагаўся вырашэння цэлага комплексу мер адносна зберажэння культурных артэфактаў Палесся: матэрыяльна-тэхнічнай, фінансавай і кадравай падтрымкі для Палескага музея ў Пінску, заснаванага ў 1924 г.; інвентарызацыі ўсіх помнікаў; вывучэння гістарычных крыніц прыватнаўласніцкіх архіваў, што знаходзіліся ў памешчыцкіх маёнтках, сядзібах заможных сялян (былой засцянковай шляхты) і інш.[116]. У выніку праведзенай інвентарызацыі ў Палескім ваяводстве пад ахову Польскай дзяржавы трапілі 138 помнікаў (культавых пабудоў, палацаў, сядзіб, рэштках замкаў і г. д.)[117]. Аналагічная праца была праведзена і на іншых заходнебеларускіх землях. Пасля структурных пераўтварэнняў у 1930-я гг. тэрыторыя Віленскага, Навагрудскага ваяводстваў увайшла ў склад Віленскай рэстаўрацыйнай акругі, Палескага ваяводства — Люблінскай акругі. Рашэнні аб рэстаўрацыі ці кансервацыі асобных помнікаў прымаліся ў залежнасці ад іх значнасці для прапагандысцкіх мэтаў, наяўнасці неабходных сродкаў. Як правіла, помнікі разглядаліся ў кантэксце польскай гісторыі і культуры на "ўсходніх крэсах".

Польскія навуковыя ўстановы, грамадскія арганізацыі навуковага профілю ў Вільні былі нацэлены на ўмацаванне польскай гістарычнай свядомасці і культуры. Сярод іх вылучаліся аднаўлены ў 1919 г. Віленскі ўніверсітэт імя С. Баторыя і Таварыства сяброў навукі (Towarzystwo przyjaciół nauk), заснаванае яшчэ ў кастрычніку 1906 г. Створаны ва ўніверсітэце ў 1925 г. этнаграфічны музей пры кафедры этнаграфіі і этналогіі, якую ўзначальвалі Ц. Эрэнкройц, К. Машынскі, выконваў функцыі навукова-метадычнага цэнтра для краязнаўчых музеяў на заходнебеларускіх землях. За кошт ахвяраванняў установ, прыватных асоб яго фонды папоўніліся да 3,8 тыс. адзінак захавання ў 1937 г. Таварыства сяброў навукі пасля праведзенай у канцы 1922 г. рэарганізацыі ў сваёй структуры сярод 3-х аддзелаў мела і грамадазнаўча-гістарычны, што выдаваў да верасня 1939 г. часопіс "Ateneum Wileńskie". Таварыства эвалюцыяніравала ад ідэй "краёвасці" да польскага рэгіяналізму, што пацвярджаецца і зменамі ў яго складзе — да сярэдзіны 1930-х гг. замест "крэсовых" памешчыкаў, рымска-каталіцкага духавенства, якія былі актыўнымі прыхільнікамі "краёвасці", большасць там складалі польскія настаўнікі, чыноўнікі.

Нягледзячы на разнастайную тэматычную накіраванасць прац віленскіх польскіх гісторыкаў, прыярытэтнае значэнне імі надавалася праблематыцы ВКЛ і Рэчы Паспалітай. У манаграфічных выданнях, артыкулах асвятляліся эканамічныя пераўтварэнні другой паловы XVIII ст. на чале з А. Тызенгаўзам (С. Касцялкоўскі), пачатковы перыяд гісторыі ВКЛ, сацыяльна-эканамічныя перадумовы экспансіі Польшчы на ўсход, гісторыя Навагрудскага ваяводства да 1795 г. (Г. Лаўмянскі), стан пісьмовых крыніц, гісторыя Полаччыны (Р. Мяніцкі) і інш. Падкрэсліваючы дастатковы навуковы ўзровень публікацый, іх тэматычную навізну, шырокую крыніцавую базу, неабходна адзначыць, што па большасці навукова-метадалагічных падыходаў яны ўкладваліся ў рэчышча тагачаснай польскай гістарыяграфічнай традыцыі: абсалютыза-

115 Лабачэўская, В. А. Зберагаючы самабытнасць: з гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В. А. Лабачэўская. — Мінск: Беларус. навука, 1998. — С. 185.

116 ДАБВ. — Ф. 1. — Воп. 11. — Спр. 476. — Арк. 27–31.

117 ДАБВ. — Ф. 1. — Воп. 1. — Спр. 489. — Арк. 17–27.

валіся польскія нацыянальныя і дзяржаўныя інтарэсы (гэта можна разглядаць у якасці дадатковага фактара, што спрыяў нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі беларускіх даследчыкаў); ідэалізавалася палітычная роля Польшчы ў інтэграцыі з ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай; пад уплывам папулярнай тады ягелонскай ідэі на падставе гістарычных звестак абгрунтоўвалася культурна-цывілізацыйная роля Польшчы адносна беларусаў і яе спрадвечнае "гістарычнае права" на "ўсходнія крэсы"; перабольшвалася значэнне асобы ў гісторыі, у асноўным увага надавалася даследаванню элітарных пластоў грамадства (магнатаў, шляхты, духавенства).

Меншай ідэалагізаванасцю вылучаліся наватарскія па сваёй метадалогіі даследаванні гісторыка-культурнай спадчыны Палесся. Менавіта там былі апрабіраваны польскай этналогіяй такія метады, як экспедыцыйны, эвалюцыйны, лінгвістычны аналіз і інш. Для правядзення параўнальнага аналізу Палесся і Навагрудчыны К. Машынскі выкарыстоўваў у сваіх працах матэрыялы, сабраныя даследчыкамі з іншых рэгіёнаў Беларусі. Акрамя таго, ён прымаў непасрэдны ўдзел у экспедыцыях. Паводле К. Машынскага, культура Палесся адрознівалася ад польскай і ўкраінскай, у ёй знаходзіліся вытокі агульнай усходнеславянскай культурнай спадчыны. На працягу 1930-х гг. на Палессі было арганізавана некалькі навуковых экспедыцый, у якіх удзельнічалі Ю. Абрэмбскі, Л. Градзіцкі, Л. Асоўскі і іншыя польскія вучоныя, студэнты. Вынікі даследаванняў дазволілі Ю. Абрэмбскаму прааналізаваць этнічную структуру Палесся, абгрунтаваць тэорыю этнічнай групы, адлюстраваць перамены ў традыцыйных этнічных супольнасцях[118].

Сярод грамадскіх арганізацый, што спрабавалі разгарнуць навуковую працу і прапаганду гістарычных ведаў непасрэдна на заходнебеларускай тэрыторыі, было Польскае гістарычнае таварыства (Polskie towarzystwo historyczne). У 1930-я гг. 2 яго аддзелы былі створаны ў Брэсце і Гродне. Як сведчаць справаздачныя архіўныя дакументы, дзейнасць Брэсцкага аддзела разгортвалася ў межах 2-х адасобленых секцый — метадычнай і краязнаўчай. Асноўнымі напрамкамі іх дзейнасці былі навукова-асветніцкая праца (лекцыі, рэфераты, дыскусіі), падрыхтоўка да друку навукова-папулярных краязнаўчых выданняў. Акрамя рэгіянальнай праблематыкі, у час лекцый закраналіся таксама наступныя тэмы: ідэя польскай незалежнасці і яе рэалізацыя; польская грамадска-палітычная думка ў кантэксце нацыянальна-вызваленчай барацьбы (1795–1918 гг.). На такіх прыкладах польскай гісторыі ў слухачоў павінна было складвацца перакананне аб неабходнасці адраджэння і ўмацавання Польскай дзяржавы. Пры разглядзе аспектаў духоўнага жыцця акцэнтавалася ўвага на самабытнасць і своеасаблівасць польскай культуры. Гродзенскі аддзел ПГТ займаўся заснаваннем навуковай гістарычнай бібліятэкі імя Ю. Пілсудскага, нацэленай на навукова-даследчыцкую і бібліяграфічна-інфармацыйную дзейнасць па праблематыцы ВКЛ. Для камплектавання яе фондаў выкарыстоўваліся ахвяраванні мясцовага дзяржаўнага архіва, розных польскіх бібліятэк Вільні і Львова. Па колькасных паказчыках аддзелы ПГТ былі нешматлікімі — налічвалі ад 20 да 40 чалавек, у асноўным польскіх чыноўнікаў, настаўнікаў (у Брэсце арганізацыю ўзначальваў кіраўнік аддзела апякунства Брэсцкай школьнай акругі А. Татамір, у Гродне — палкоўнік Т. Фундальскі)[119].

На заходнебеларускіх землях уплыў ПГТ быў абмежаваны толькі асобнымі польскімі адукацыйнымі ўстановамі, аднак у іх навучэнцкай моладзі давалася выключна польская інтэрпрэтацыя гісторыі краю. У кантэксце ідэалагічных установак рэформы адукацыі 1932 г. свядома дэманстраваліся толькі перыяды, падзеі, звязаныя з росквітам польскай дзяржаўнасці ў мінулым. Хоць у рамках прадэклараванай у 1926 г. палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі патрабавалася стварэнне ўмоў для пазітыўнага існавання нацыянальных меншасцей, да якіх залічвалі беларусаў, а вучэбнымі праграмамі прадугледжвалася ўключэнне матэрыялаў аб іх гісторыі і культуры, аднак падавалася гэта эпізадычна і ў якасці доказу цывілізацыйнай ролі Польшчы на "ўсходніх крэсах". Пад уздзеяннем сацыяльных

[118] Obrębski, J. Problem etniczny Polesia / J. Obrębski // Sprawy narodowościowe. — 1936. — № 1–2. — S. 1–21; ДАБВ. — Ф. 1. — Воп. 8. — Спр. 1652. — Арк. 27–27адв.

[119] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). — Ф. 109. — Воп. 1. — Спр. 1. — Арк. 26; Спр. 6. — Арк. 1–31; Спр. 5. — Арк. 29–30; Спр. 2. — Арк. 14; Ф. 108. — Воп. 1. — Спр. 4. — Арк. 3; Спр. 2. — Арк. 1, 53.

супярэчнасцей нельга было спадзявацца на ўзмацненне паланафільскіх настрояў сярод беларускага грамадства, хоць частка яго была ахоплена польскімі школамі, грамадскімі арганізацыямі. Як успамінаў былы вучань польскай гімназіі ў Навагрудку У. Калеснік, рэаліі тагачаснага жыцця ставілі пад сумненне аб'ектыўнасць атрыманых там гістарычных ведаў: гэты горад з яго гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі меў раздвоенае ўспрыняцце — "адзін тутэйшы, беларускі, і другі — прыезджы, чыноўніцкі, польскі, панскі"[120].

Для рэалізацыі кансервацыйнай задачы польскага рэгіяналізму выкарыстоўваліся магчымасці таварыстваў дапамогі народным промыслам, якія ўзніклі ў 1924–1927 гг. у Вільні, Брэсце, Навагрудку. Паводле статута 1928 г., мэтай Палескага таварыства было захаванне, развіццё і арганізацыя існуючых на тэрыторыі Палескага ваяводства промыслаў, захаванне іх архаічнага характару, спрыянне з'яўленню іх новых відаў[121]. Сярод ініцыятараў стварэння таварыстваў былі кіраўнікі ваяводстваў — Палескага (К. Младзяноўскі, Я. Крагельскі), Навагрудскага (З. Бечковіч). У канцы 1920-х — пачатку 1930-х гг. было наладжана актыўнае даследаванне традыцыйнай мастацкай культуры Палесся, збор калекцыі прадметаў народнага мастацтва (тканін, адзення, керамікі і інш.). Дапамогу ў гэтай справе аказвала жонка палескага ваяводы Я. Крагельская. Улічваючы тое, што не былі створаны асобныя беларускія нацыянальныя арганізацыі, што займаліся народным мастацтвам і промысламі, то можна ў цэлым даць пазітыўную ацэнку дзейнасці згаданых таварыстваў у гэтым напрамку. Аднак нельга пагадзіцца з тым, што дзейнасць заходнебеларускіх таварыстваў дапамогі народных промыслаў, не маючы акрэсленай нацыянальнай накіраванасці і не будучы непасрэдна звязана з беларускім нацыянальным рухам, набыла патрыятычны (г. зв. краёвы характар)[122].

Большай эфектыўнасцю ў рэалізацыі тэорыі рэгіяналізму на заходнебеларускіх землях выдзялялася Польскае краязнаўчае таварыства (Polskie towarzystwo krajoznawcze; ПКТ), заснаванае ў 1906 г. у Варшаве. Замест аўтаномных рэгіянальных арганізацый (адна з такіх была створана восенню 1924 г. у Пінску) у ходзе праведзенай у сярэдзіне 1930-х гг. рэарганізацыі была ўведзена жорсткая цэнтралізацыя, якая паставіла ў непасрэдную залежнасць усе мясцовыя структурныя адзінкі, у складзе якіх абсалютную большасць складалі польскія настаўнікі і чыноўнікі. Сярод мясцовых арганізацый ПКТ у Заходняй Беларусі, якія аб'ядноўвалі ў 1936 г. 468 чалавек, найбольш шматлікія былі ў Навагрудку, Пінску. Прадстаўнікі аддзелаў ПКТ прыцягваліся да розных ідэалагічных кампаній[123].

Сярод асноўных напрамкаў дзейнасці структурных адзінак ПКТ неабходна вылучыць наступныя: падрыхтоўка і выданне навуковай, навукова-папулярнай літаратуры, краязнаўчай перыёдыкі; арганізацыя выставак, культурна-мастацкіх мерапрыемстваў; правядзенне навукова-пошукавай працы, стварэнне і ўтрыманне краязнаўчых музеяў; ажыццяўленне навукова-асветніцкай працы сярод розных катэгорый насельніцтва. Краязнаўчая польскамоўная літаратура не з'яўлялася аднатыпнай: разам з манаграфіямі выдаваліся і брашуры, даведнікі, бібліяграфічныя паказальнікі. Пераважалі ў асноўным навукова-папулярныя працы, аднак іх узровень быў розным. Напрыклад, на падставе археалагічных даследаванняў і архіўных крыніц напісаны працы Ю. Ядкоўскага па старажытнай гісторыі і культуры Гродзеншчыны, сярод якіх якія былі "Гродна" (1923 г.), "Умацаваная царква на Каложы ў Гродне ў святле архіўных і археалагічных даследаванняў 1935 г." (1936 г.). Заслужана была адзначана ўзнагародай ПКТ манаграфія О. Гедэмана "Гісторыя Браслаўскага павета" (1930 г.) і яго шэраг іншых прац па гісторыі Падзвіння. На багатай крыніцавай аснове падрыхтаваны манаграфіі А. Нелярда "Ілюстраванае Палессе" (1923 г.), М. Разанава па гісторыі Пружанскага павета (1935 г.) і інш.

Шматлікія краязнаўчыя артыкулы змяшчаліся на старонках цэнтральнага друкаванага органа ПКТ — часопіса "Ziemia" ("Зямля"), а таксама ў мясцовых краязнаўчых выданнях.

120 Калеснік, У. Доўг памяці / У. Калеснік. — Брэст: ААТ "Брэсцкая друкарня", 2005. — С. 81–82.

121 ДАБВ. — Ф. 1. — Воп. 9. — Спр. 375. — Арк. 1, 5.

122 Лабачэўская, В. А. Зберагаючы самабытнасць: з гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В. А. Лабачэўская. — Мінск: Беларус. навука, 1998. — С. 192.

123 ДАГВ. — Ф. 551. — Воп. 1. — Спр. 1297. — Арк. 1–7.

Акрамя прыватных ахвяраванняў, для друкавання краязнаўчай літаратуры і перыёдыкі актыўна выкарыстоўваліся субсідыі органаў мясцовага самакіравання, зрэдку сродкі дзяржаўных структур (апошняя крыніца фінансавання разам з дапамогай польскага Фонду нацыянальнай культуры была асноўнай для Таварыства сяброў навукі ў Вільні). З сярэдзіны 1930-х гг. мясцовыя ўлады надавалі большую ўвагу краязнаўчаму друку. Напрыклад, планавалася з 1937 г. стварыць у Навагрудскім ваяводстве сетку структурных адзінак выдавецкага таварыства, якое павінна было займацца друкаваннем краязнаўчай літаратуры "ў дзяржаўным і нацыянальным духу"[124].

Вывучэнне краязнаўчых прац дазваляе вылучыць шэраг іх асаблівасцей: кампіляцыйны характар; фрагментарнасць і абмежаванае кола крыніц, да якіх мелі доступ аўтары; навукова-папулярны ці нават публіцыстычны стыль выкладання пераважна наратыўнага (апавядальнага) матэрыялу; прысутнасць у тэксце аўтарскага эмацыянальна-псіхалагічнага кампанента; уключэнне фальклорна-міфалагічных элементаў. Улічваючы практычную арыентаванасць, нярэдка ў іх змяшчаліся парады і рэкамендацыі для турыстаў, даследчыкаў (з указаннем гасцініц, месцаў для адпачынку і інш.).

Праведзены кантэнт-аналіз зместу краязнаўчых прац паказаў, што ў іх пераважна прысутнічала польская інтэпрэтацыя гістарычных працэсаў, падзей, асоб. Характэрнай рысай з'яўлялася рамантызацыя гісторыі з выкарыстаннем элементаў ірацыянальнага, гераізацыяй і эмацыянальна-экспрэсіўнай ацэнкай мінулага, што было вынікам уздзеяння пашыранай у польскай грамадскай свядомасці ягелонскай ідэі. Аўтары імкнуліся паказаць ролю і месца канкрэтнай мясцовасці, горада ў кантэксце палітычнай гісторыі Польшчы, асабліва перыяду Рэчы Паспалітай. Акцэнтавалася ўвага на адмоўнай ацэнцы ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі, негатыўных выніках нацыянальнай палітыкі царызму, падзеях паўстанняў 1830, 1863–1864 гг. Улічваючы значнасць праблемы каланізацыі заходнебеларускага рэгіёну, у асобных працах прыводзіліся звесткі аб доўгатэрміновай прысутнасці там палякаў, паказваўся ход засялення імі Палесся[125]. Знаходжанне гэтых зямель у складзе Польскай дзяржавы ("адноўленай Польшчы-Маці") пасля 1921 г. прадстаўлялася ў якасці перспектыўнай магчымасці для іх цывілізацыйнага развіцця[126].

Акрамя выдання краязнаўчай літаратуры, мясцовыя структуры ПКТ немалое значэнне надавалі арганізацыі выставак, правядзенню розных культурна-мастацкіх мерапрыемстваў, лекцыйнай працы. Напрыклад, аддзел ПКТ у Брэсце на працягу 1925 г. ахапіў лекцыямі больш 800 чалавек. Сярод лектараў былі археолаг Р. Якімовіч з Варшавы і іншыя польскія вучоныя, грамадскія дзеячы[127]. Менавіта з выставачнай дзейнасці пачалося стварэнне многіх краязнаўчых музеяў. Вялікая цікаўнасць з боку грамадскасці Гродна да выстаўкі каштоўнасцей, наладжанай Ю. Ядкоўскім, Л. Вільконскім у верасні 1921 г., паспрыяла заснаванню там гістарычнага музея. Важнае значэнне ў дзейнасці мясцовых аддзелаў ПКТ займала праца па ўшанаванні памяці землякоў, якія праславіліся ў польскай гісторыі.

Немалое значэнне структурамі ПКТ надавалася і пазашкольнай працы з навучэнцкай і студэнцкай моладдзю. Акрамя навукова-асветніцкай, краязнаўчай, прывабнай была экскурсійна-турыстычная дзейнасць, якая дазваляла разглядаць помнікі гісторыі і культуры заходнебеларускіх зямель у якасці неадрыўнай часткі польскай спадчыны[128].

У стварэнні і функцыянаванні краязнаўчых музеяў на тэрыторыі Заходняй Беларусі (да канца 1930-х гг. іх разам з музейнымі калекцыямі было 9[129]) важнае значэнне меў асобасны фактар. Гісторыя большасці з гэтых устаноў непасрэдна звязана з неардынарнымі асобамі, іх самаадданай працай на аматарскім узроўні: Палескага музея ў Пінску — Д. Ге-

[124] ДАБВ. — Ф. 1. — Воп. 10. — Спр. 1180. — Арк. 44.

[125] Marczak, M. Przewodnik po Polesiu / M. Marczak. — Brześć nad Bugiem: Oddział PTK w Brześciu nad Bugiem, 1935. — S. 24–25.

[126] Rozanów, M. Powiat Prużański (szkic historyczny). — Prużana, 1935. — S. 31.

[127] Rocznik Poleski. — Brześć nad Bugiem, 1926. — S. 5–7.

[128] Koła krajoznawcze młodzieży szkolnej Polskiego Towarzystwa Krajoznawczego. — Kraków: PTK, 1937. — 50 s.

[129] Гужалоўскі, А. А. Музеі Беларусі (1918–1941 гг.). — С. 141.

аргіеўскага, Р. Гарашкевіча, Ю. Абухоўскага, гістарычнага музея ў Гродне — Ю. Ядкоўскага, краязнаўчага музея ў Слоніме — І. Стаброўскага, краязнаўчага музея ў Ваўкавыску — Ч. Будына-Давыдоўскага, Г. Пеха, краязнаўчага музея ў Баранавічах — Л. Турскага. Як правіла, іх прыватныя зборы былі адчувальнымі ці нават фондаўтваральнымі пры адкрыцці музеяў. Улічваючы грамадскі статус музейных устаноў, важнае значэнне мела матэрыяльная і маральная падтрымка з боку кіраўнікоў органаў мясцовага самакіравання, прыватныя ахвяраванні. Акрамя гэтага, неабходна прызнаваць мэтанакіраваную дзейнасць цэнтральнага кіраўніцтва ПКТ па стварэнні музеяў на "ўсходніх крэсах". Паскарэнне гэтага працэсу на заходнебеларускіх землях з канца 1920-х гг. трэба звязваць з пратэкцыянісцкімі адносінамі мясцовай польскай адміністрацыі пасля адпаведнага ўрадавага цыркуляра 1928 г., які абавязваў аказваць аддзелам ПКТ спрыянне ў гэтай справе. Наогул, пры значнай ролі ініцыятывы прыватных асоб у станаўленні краязнаўчых музеяў канцэптуальнымі ў іх дзейнасці заставаліся тэарэтычныя палажэнні рэгіяналізму.

У цэлым, польскія таварыствы (асабліва ПКТ) унеслі пэўны ўклад у правядзенне гісторыка-культуралагічных даследаванняў, ахову помнікаў, стварэнне краязнаўчых музеяў. Яны разгарнулі на заходнебеларускіх землях мэтанакіраваную дзейнасць па распаўсюджванні гістарычных ведаў, якія адлюстроўвалі канцэптуальныя пазіцыі польскай гістарычнай навукі, адпавядалі польскім дзяржаўным і нацыянальным інтарэсам. Пры выкарыстанні розных форм навукова-асветніцкай, краязнаўчай працы папулярызаваліся помнікі гісторыі і культуры ў якасці каштоўнасцей польскай ці рэгіянальна-польскай культуры.

**Aleksandr Wabiszczewicz,**
*Nauki historyczne i kulturoznawcze oraz edukacja historyczna w Zachodniej Białorusi (1921–1939)*

Istotnymi czynnikami kształtowania świadomości narodowej ludności białoruskiej na obszarze, nazwanych pózniej Zachodnia Białorusią, były prace i badania historyczne oraz edukacja historyczna, prowadzone przez nieliczne białoruskie towarzystwa naukowe i wydawnictwa, a także polskie instytuty naukowe i organizacje społeczne. Autor analizuje działalność w tym zakresie takich instytucji, jak Białoruskie Towarzystwo Naukowe, prasa o orientacji narodowej i chrześcijańsko-demokratycznej, Uniwersytet Stefana Batorego w Wilnie, Towarzystwo Przyjaciół Nauk, Polskie Towarzystwo Historyczne czy Polskie Towarzystwo Krajoznawcze. Konstatuje, iż polskie stowarzyszenia naukowe wniosły znaczący wkład do badań nad historią i kulturą Białorusi, ochrony pamiątek kultury, powstawanie krajoznawczych placówek muzealnych. Działalność ta na obszarze Kresów Północno-Wschodnich ukierunkowana była na rozwój wiedzy historycznej, odpowiadającej ówczesnych kierunkom historiografii polskiej, zgodnej z interesem państwowym i narodowym Polski.